***Анна Альштынюк***
*Беласток*

# Матыў прамінання ў лірычных мініяцюрах Янкі Брыля

Загадка жыцця і смерці – адна з найгалоўных праблем, якую здаўна імкнуцца спасцігнуць, раскрыць навука і мастацтва. Літаратура таксама заўсёды імкнулася да аналізу чалавека ў каардынатах жыцця і смерці, але у кожную эпоху рабілася гэта па-свойму. Так, сярэднявечныя пісьменнікі і паэты звярталіся да тэмы смерці ў кантэксце "Vanitas vanitatum" і "Memento mori". Рэнесанс сарваў з лозунгамі папярэдняй эпохі, а іх месца заняло "carpe diem", якое падкрэслівала, што самае галоўнае – максімальнае выкарыстанне кожнай хвіліны. Чалавек таго часу не задумваўся над паняццем смерці, бо лічыў, што важней за ўсё – матэрыяльнае забеспячэнне патрэб. Эпоха барока культывавала сярэднявечныя матывы. Размова пра хуткаплыннасць жыцця працягвалася і ў наступныя культурна-гістарычныя эпохі ў адпаведнасці з уласцівым ім духам.

Для ўдзельнікаў жахлівых ваенных падзей, для тых, хто зведаў жорсткасць таталітарнай сістэмы, часта смерць аказвалася выратаваннем ад мук і адначасова найгоршым цярпеннем. Хочацца ўзгадаць тут дакументальную кнігу "Я з вогненнай вёскі...", якая з'яўляецца споведдзю жыхароў спаленых беларускіх вёсак, тых, каму ўдалося выратавацца. Праца над пякучым матэрыялам сталася для яе аўтараў, Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Уладзіміра Калесніка, своеасаблівым іспытам. Пісьменнікі мусілі вызваліцца ад таго невымернага чалавечага болю, які назапасіўся падчас працы над кнігаю ў іхніх душах. І кожны з іх па-свойму выходзіў з-пад прэсу, народжанага горкімі ўспамінамі людзей, якія падзяліліся з пісьменнікамі самымі жахлівымі ўражаннямі

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
*Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku – kontynuacja,*
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki
na podstawie umowy BIBL/SP/0040/2023/01

іх жыцця. Пасля працы над гэтай кнігай Алесь Адамовіч адчуў *пісьменніцкае права і магчымасць усё святло скіраваць, кінуць у самую цемру пякельную – ужо на саміх карнікаў, фашысцкіх забойц*[1]. Ён напісаў глыбока трагічную, асуджаючую фашызм аповесць "Карнікі".

Янка Брыль пайшоў, аднак, супрацьлеглым шляхам і стварыў поўную гумару аповесць "Ніжнія Байдуны", пацвердзіўшы такім чынам, што верны сваёй чалавечай і творчай асабовасці. Бо Янка Брыль перш за ўсё быў жыццярадасным творцам, які цешыўся навакольным светам. Усё свае жыццё Я. Брыль прысвяціў служэнню чалавеку і чалавецтву. Ва ўсіх сваіх творах вучыў быць добразычлівым, уважлівым, любіць іншых.

Жанр мініяцюры, форма малой прозы, дазволіла пісьменніку шчыра гаварыць з чытачом пра ўсё: пра важнае і другараднае, прыгожае і брыдкае. Найярчэй гэта адлюстравалася ў яго лірычных занатоўках, якія, безумоўна, сталіся галоўным і ўлюбёным жанрам пісьменніка. У лірычных запісах чуецца голас чалавека, які ўмеў цешыцца жыццём і даражыць ім. Кожная хвіліна, паводле пісьменніка, незвычайная, цудоўная. Сумныя ж моманты па кантрасту дазвалялі яму яшчэ глыбей адчуваць навакольную прыгажосць. І хаця такіх момантаў у жыцці Янкі Брыля было шмат, але заставаўся ён пясняром радасці жыцця, якая перадавалася і чытачу. За такое ўспрыманне жыцця беларускі пісьменнік удзячны Льву Талстому, які вельмі рана стаў яго творчым і жыццёвым аўтарытэтам: *Радасна ўспомніў другое прадвесне – ажно трыццаць трэцяга года. Той час, калі я захапляўся народнымі апавяданнямі Талстога – першага, хто мяне навучыў па-сапраўднаму любіць жыццё*[2]. Дзякуючы ў значнай ступені яму, Янка Брыль зразумеў, колькі прыгажосці ў навакольным свеце і што яго задача і абавязак, як майстра слова, у тым, каб павялічваць колькасць прыгожага ў жыцці іншых.

Шчырыя, поўныя любові і ўнутранай цеплыні словы раскрываюць вочы чытачоў на тыя светлыя з'явы, якія існуюць побач, але часта не заўважаюцца намі. Янка Брыль узнаўляе падрабязнасці навакольнага свету, і мы раптам адкрываем іх прыгажосць. Пісьменнік знаёміць нас з добразычлівымі людзьмі і вось мы пачынаем сустракаць іх у жыцці. Спеў птушак, шум ручая, усмешка маці, пяшчотныя словы каханага чалавека – такім цудоўным зместам насычаны лірычныя занатоўкі.

---

1 Алесь Адамович, *Собрание сочиненний в 4 томах*, Минск 1982, т. 4, с. 376.

2 Янка Брыль, *Збор твораў у чатырох тамах*, Мінск 1968, т. 4, с. 66.

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
*Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku – kontynuacja,*
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki
na podstawie umowy BIBL/SP/0040/2023/01

І чытач, як у свой час зусім малады Я. Брыль ад Л. Талстога, можа пераняць ад беларускага пісьменніка ўменне быць шчаслівым, радавацца жыццю, максімальна выкарыстоўваць кожную яго хвіліну. Зразумела, што хвалявала Я. Брыля і тэма чалавечага сыходу ў Вечнасць. Творчасць яго сведчыць аб тым, што на працягу доўгага жыцця адносіны Я. Брыля да гэтай важнай праблемы эвалюцыяніравалі.

Сам Янка Брыль вельмі рана сутыкнуўся са смерцю. Яму было толькі шэсць з паловай гадоў, калі памёр яго бацька Антон Данілавіч. Уладзімір Калеснік пісаў, што Янка Брыль *не адразу мог зразумець увесь цяжар гэтай утраты для сябе асабіста і для сям'і. Сэнс яе адкрыецца паступова, у меру духоўнага сталення і працы над вясёлымі і трагічнымі канфліктамі ранніх апавяданняў.* (...) *Смерць бацькі жыла ў ім як неад'емная старонка лёсу, часціна яго духоўнага свету*[3]. Дзякуючы турботам маці, сяброўскім адносінам са старэйшым на тры гады братам Мішам, вучобе, якая давала яму многа радасці, малы Янка пражыў па-свойму шчаслівае маленства. Але чорныя хмары нявіслі над сям'ёй Брылёў і некалькімі гадамі пазней у сувязі з цяжкімі матэрыяльнымі ўмовамі Янка мусіў пакінуць вучобу ў Наваградскай польскай гімназіі, што не здарылася б, пэўна, пры жыцці Антона Данілавіча.

Мабыць, гэтая першая страта востра ўзгадалася Я. Брылём, калі яго пяцігадовы сын упершыню сутыкнуўся з тым, што нібы выходзіць за межы дзіцячага свету, рушыць уяўленне аб вечнасці:

> (...) хлопец не даваў мне спакою доўга: а што, а як, а чаму?.. Аднак для яго гэта – самы першы пачатак пакутлівага роздуму над тым, што жыццё чалавека – ой, як далёка і як бязлітасна, жорстка не вечнае. Малы будзе яшчэ вельмі доўга думаць, што людзі *паміраюць*, а потым прыйдзе час на думкі, што і я *таксама памру...*[4].

Смерць суседа раскрывае перад хлопчыкам найбалючую праўду жыцця, якую прыняць ён здолее толькі з часам. Пісьменнік-бацька добра разумее ўзрушэнне свайго дзіцяці. Вяртаюцца, пэўна, горкія дзіцячыя ўспаміны, якія выкарыстаў пісьменнік і ў гісторыі Алеся Руневіча (раман "Птушкі і гнёзды"), які таксама мусіў змірыцца з вялікай дзіцячай трагедыяй. Аднак, як слушна заўважае Брыль, далёкая дарога паміж прыняццем адыходу кагосьці і ўсведамленнем таго, што кожнага чакае развітанне з жыццём.

---

[3] Уладзімір Калеснік, *Янка Брыль. Нарыс жыцця і творчасці*, Мінск 1990, с. 31.

[4] Янка Брыль, *Запаветнае. Выбраныя творы*, Мінск 1999, с. 389.

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
*Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku – kontynuacja,*
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki
na podstawie umowy BIBL/SP/0040/2023/01

Ужо ў першай кнізе лірычных мініяцюр "Жменя сонечных промняў" Янка Брыль гаворыць пра смерць і нярэдка пра пахаванне, выказвае свой сум, але як бы з пазіцыі назіральніка, які не адчувае і сябе смяротным. Параўноўвае сітуацыі і крыху як бы здзіўляецца сваёй рэакцыі:

> Адзін стары, бацька майго таварыша, гаварыў, паміраючы, што найбольш яму шкада расставацца з прыродай.
>
> А мне было б з кнігамі... (...)
>
> Але чаму я запісваю гэта спакойна? Сытая, вялая абыякавасць? Упэўненасць у нечым, што пераможа смерць?.. Ці проста таму, што я думаю пра гэта яшчэ ўсё адцягнена: "было б"?...[5]

Відаць, росквіт чалавечага веку перамагае відавочнае. Побач з пісьменнікам людзі старэюць і паміраюць, але ён абаронены пакуль натуральнай жыццёвай сілаю. Хоць пры тым, аднак, аналізуе сябе знутры і прыходзіць да слушных высноў.

Цыкл мініяцюр "Пра галоўнае" ўжо самой назвай сведчыць, што тут пісьменнік задумваецца над самымі важнымі пытаннямі пра жыццё і смерць. Запісы рабіліся ў 1960–1975 гадах, калі Я. Брылю было ўжо за сорак. *Пачынаю ўжо лічыць свае гады, нібы рублі пад канец камандзіроўкі...*[6] – прызнаецца пісьменнік, адчуваючы ўжо, відаць, што наперадзе часу менш, чым за плячыма. Аднак Брыль, разважаючы аб прамінанні, засяроджваецца над пытаннем пра шчасце і горыч свядомага існавання: *Якія жудасна шчаслівыя гады і дні нашай любві, дружбы, і як жа часта марнуем іх на пустое!..*[7]. Асэнсоўваючы жыццё, выказваючы прэтэнзіі да сябе, пісьменнік апасродкавана звяртаецца да чытача, каб таксама задумаўся над тым, якія задачы ставіць перад ім жыццё і ці адпаведна чаканаму зместу яны выконваюцца. Больш таго, пісьменнік сам спазнаў, як гэта нялёгка адпавядаць патрабаванням кожнага моманту:

> За паўстагоддзя з гакам многа і пражытага, і перажытага, і сёе-тое зроблена. А яшчэ больш – змарнавана часу...
>
> Што ж, чалавек – не механізм з гарантаванай дакладнасцю, і калі ён не заўсёды мог трымаць сябе ў руках – ёсць, відаць, у гэтым нейкая заканамернасць[8].

---

[5] Янка Брыль, *Збор твораў у чатырох тамах*, т. 4, с. 89.

[6] Янка Брыль, *Запаветнае*, с. 394.

[7] Тамсама, с. 390.

[8] Янка Брыль, *Запаветнае*, с. 390.

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
*Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku – kontynuacja,*
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki
na podstawie umowy BIBL/SP/0040/2023/01

Нават машыну час ад часу трэба падладоўваць, каб спраўна працавала, а што гаварыць пра чалавека! Часам трэба спыніцца, перадыхнуць, агледзецца, урэшце, ці ў тым накірунку рухаемся. Пісьменнік гэта разумее, але разам з тым не да канца пагаджаецца, што ўсё ж не даецца загаспадараваць сваім часам цалкам. У канцы мініяцюры Я. Брыль прызнаецца, што не першы і, пэўна, не апошні раз ён са скрухай думае пра час, які мог быць лепш выкарыстаны. Яму сумна ад гэтага ўсведамлення і ў чарговы раз ён пераконвае і сябе, і чытача, што трэба цаніць кожнае імгненне: *няма чаго адкладваць многае на заўтра, няма чаго кудысьці ўсё спяшацца... А чаго? Каб потым азірнуцца і заплакаць? Што бег ды не дабег, а многае мінуў*[9].

Ва ўсіх сваіх кнігах Янка Брыль вядзе з чытачом шчырую размову пра складанасць людскога лёсу, пра супярэчнасці жыцця. Ён падкрэслівае, што часам, каб зразумець, што ж найгалоўнае, каб даражыць сям'ёй, сябрамі, прыродай і самім дарам жыцця, трэба глянуць на сябе збоку, з другой пазіцыі. Я. Брыль нібы паўтарае ўслед за Максімам Багдановічам, зорка якога пагасла заўчасна: *Жывеш не вечна чалавек, / Пераживі ж у момант век! / Каб хвалявалася жыццё, / Каб больш разгону ў ім было, / Каб цераз край душы чуццё / Не раз, не два пайшло! / Жыві і цэльнасьці шукай, / Аб шыраце духоўнай дбай*[10]. Ад самога ж чалавека ў значнай ступені залежыць, як пакіруе сваім жыццём. У штодзённых спробах схапіць птушку шчасця мы часта не заўважаем, што яно побач: у адносінах з блізкімі людзьмі, з прыродай. Янка Брыль якраз радуецца таму, што натуральнае і адвечнае: *ад сонца на дварэ, ад кнігі на стале мне светла, цёпла*[11].

У выдадзенай у 2003 годзе кнізе Я. Брыля "З людзьмі і сам-насам" таксама пераважае роздум пра час і лёс чалавека. Аднак складаюць яе запісы, зробленыя пісьменнікам у салідным узросце, які ўсё часцей адчувае недахопы свайго цела: а вось пухлі ногі, змагаўся з бяссонніцай, трэба ісці да лекара. Ды ўзрост вызначаецца не гадамі, а – унутраным самаадчуваннем. Душой пісьменнік не старэе, а, здаецца, толькі сталее. У ім надалей жывая радасць перад адкрыццём новага, гарачая прага жыцця, якое ён прымае зацікаўлена, эмацыянальна ва ўсіх яго спектрах. Пісьменнік прама гаворыць аб тым, што *Здаровіцца-нездаровіцца, ведаем, улічваем, неяк абараняемся, а вось жа здаецца, што ўсё гэта – твой стан, стан твайго арганізма – як быццам не ты сам,*

[9] Тамсама, с. 392.

[10] Максім Багдановіч, *Поўны збор твораў. Ў 3 тамах*, Мінск 2001, т. 1, с. 121.

[11] Янка Брыль, *З людзьмі і сам-насам. Запісы, мініяцюры, эсэ*, Мінск 2003, с. 84.

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
*Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku – kontynuacja,*
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki
na podstawie umowy BIBL/SP/0040/2023/01

*а штосьці другое, дадатковае, пабочнае, дзе цябе, самога цябе пасялілі...*[12]. Хіба цела становіцца клеткай? Мабыць так, але толькі звонку, бо духоўная, інтэлектуальная форма застаецца поўнай сіл і пераадольвае фізічную слабасць, знаходзячы шчасце ў зліцці з красой прыроды, у кнігах, вяртанні ў часы маленства, і, вядома, творчасці.

Размова пра праміананне працягваецца і набывае новыя адценні ў кнізе “Блакітны зніч” (2004), прысвечанай памяці жонкі Ніны Міхайлаўны. Здаецца, як ніколі раней, раскрывае пісьменнік перад чытачамі сэрца, распавядаючы пра сваё каханне, шлюбнае жыццё, хваробу і боль страты дарагога чалавека. Колькі ў кнізе светлых успамінаў, гэтулькі і сумных, кранаючых амаль фізічна. Аказваецца, і ў жыццярадасных людзей здараюцца моманты пачуцця самоты, безнадзейнасці, і яны мусяць пакутліва, настойліва іх пераадольваць. Апошняя кніга Янкі Брыля “Парастак” (2006) – працяг лірычнай споведзі чалавека, які ўяўляе сабе, што яго час развітацца са светам ужо наблізіўся. Пісьменнік не баіцца гэтага, бо лічыць, што пачнецца новы раздзел, што дзесьці ў блізкім далёкім ён сустрэнецца з тымі, па кім сумуе. Для яго смерць ужо, хіба, ратунак ад болю, самоты, неразумення.

Адыходу ў Вечнасць блізкага чалавека заўсёды спадарожнічаюць адчай, боль, якім, здаецца, канца не будзе. Чалавеку хочацца хадзіць па сцежках, любавацца красою прыроды, нават калі яму ўжо за дзевяноста. Смерць заўсёды прыходзіць не ў час... І ці хтосьці яе чакае? Нават цяжкахворыя людзі часта пацяшаюць сябе надзеямі, хаця ведаюць, што прыйдзецца пакінуць зямны побыт, хаця адчуваюць, што смерць побач. Іх родныя да апошняй хвіліны таксама не дапускаюць да сябе думак пра расстанне. Пісьменніку такія пачуцці вядомыя. Ён развітаўся назаўжды з самымі блізкімі людзьмі, што знайшло адлюстраванне ў яго творах. Вось ён прыйшоў адведаць жонку Ніну Міхайлаўну ў апошнім месцы яе спачыну, дзе побач, уласна, і яму падрыхтавана месца:

> Над саснова-бярозавым лесам на ўзгорках, над неаглядным шматлюддзем помнікаў у шырокай, з лагодным спадам даліне далекаватых прыгарадных могілкаў ужо не **ёй** спявае сонечны, з белымі хмаркамі вераснёвы блакіт...
>
> Апошняе месца на роднай зямлі я аплаціў на дваіх рублямі, загадзя сабранымі (...), так увайшоўшы ў незалежна-свабодны спакой на душы ад таго, што вось і ведаю, куды і да каго пайду. А ўжо **калі** ды **як** – нікому ж такога ведаць не дадзена...[13].

---

[12] Янка Брыль, *З людзьмі і сам-насам*, с. 73.

[13] Янка Брыль, *Блакітны зніч. Лірычнае*, Мінск 2004, с. 54.

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
*Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku – kontynuacja,*
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki” Ministra Edukacji i Nauki
na podstawie umowy BIBL/SP/0040/2023/01

Мініяцюры Янкі Брыля пра жонку – поўныя пяшчоты і цёплых слоў, але і несціханага болю, выкліканага яе стратай. Так любіць! Усім сэрцам і душою, шчыра і ўсё жыццё. Свет без яе не цешыць. Аднак жыццё плыве надалей і пісьменнік разумее, што яму трэба жыць, нязмушана чакаць *свайго* часу. Ён развітаўся з жонкай на нейкае імгненне, а пакуль мусіць цешыцца кожнай хвілінай, якая яму яшчэ належыць. Брыль умацоўвае ў сабе новыя псіхалагічныя станы:

> ...Адзін я? Ці ўдваіх... з самім сабою?
> Таму часам і загаворваю, як быццам з некім другім, і спяваю, нібы не толькі самому сабе, адчыняю халадзільнік і часам жыва здаецца, што вось і **будзем** снедаць...
> Што гэта?
> Ці, можа, яно й нармальна для самотнай старасці[14].

Смерць прыходзіць заўсёды заўчасна і нечакана. Чалавек ніколі да канца не падрыхтаваны да спаткання з ёй, асабліва калі яна забірае маладых. Янку Брыля да глыбіні душы ўразіла смерць А. Пісьмянкова: *Ахнуў, пачуўшы пра смерць Алеся Пісьмянкова, хлапчыны слаўнага, таленавітага паэта... І адразу падумалася: як гэта добра, што я ў свой час... (...) на прысланую ім кнігу з цёплым аўтографам, у шчырасць якога ў суме верыцца неяк па-новаму, я пазваніў маладому сябру дахаты (быў выхадны) і сказаў сваё ўражанне і ад кнігі, і ад чытанага раней*[15]. Я. Брыль неаднойчы са смуткам гаварыў чытачу пра смерць блізкіх людзей, знаёмых і тых, каго ведаў толькі са слыху. Гучалі ў такіх мініяцюрах боль, шкадаванне, туга, а таксама, як у выпадку з Алесем Пісьмянковым, рэфлексія аб тым, як важна паспець у час сказаць добрае слова.

Фізічная ростань не мае ўлады над памяццю, тым светлым, прыгожым, што было ў чалавека і ўжо назаўсёды належыць яму:

> І маці бачыцца мне маладою, і сястра з маленькімі далонькамі... Годнаю рымскаю лічбай пазначыў у памяці – канец XIX стагоддзя!.. Нібы й гісторыя, і ледзь не сцішната – колькі пражылося! Да мяне, са мною, без іх...[16].

Пісьменнік і захапляецца, і здзіўляецца адначасна, які доўгі век дадзена яму было пражыць, што непазбежна звязана з набыткамі

---

[14] Янка Брыль, *Парастак. Запісы і эсэ*, Мінск 2006, с. 46.

[15] Янка Брыль, *Парастак*, с. 16.

[16] Тамсама, с. 50.

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
*Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku – kontynuacja,*
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki” Ministra Edukacji i Nauki
na podstawie umowy BIBL/SP/0040/2023/01

і стратамі. Пісьменнік знайшоў свае спосабы на пераадоленне тужлівых думак пра прамінанне. Ён дзеліцца імі з чытачом. Адзін з такіх спосабаў: праводзіць час з дзецьмі: *Усюды дзеці – унукі майго пакалення, з якімі трэба быць бліжэй, асвяжаючы душу*[17].

Ёсць у Брыля і развагі пра тое, што час вельмі хутка бяжыць і нельга яго стрымаць, як і немагчыма пасунуць назад: *Жыццё чалавечае – як агонь. Быў і няма. Зноў загарэлася і патухла. Зноў гарыць. І так – бясконца. Тая самая вечная, таямнічая і цудоўная справа*[18]. Так, чалавек напамінае ў нечым агонь, які гарыць, змагаючыся часта з ветрам ці дажджом. А калі адно полымя згасне, людзі распаляць новае. З жыццём справа падобная – адно нараджаецца дзякуючы другому. Памірае чалавек і ягонае месца займае хтосьці новы. І ў гэтым заключаецца сапраўдны цуд існавання, які надае сэнс чалавечаму жыццю.

Пісьменнік увесь час разважае над самім працэсам жыцця, шукае адказу на пытанне, ці правільна жыве. І прыходзіць да мудрай высновы, такой карыснай і для чытача: *І ніколі гэта не позна – пазнаваць сапраўднае. Хоць і лепш было пабагацець раней*[19].

Так, неаднойчы пісьменнік дапамагае чытачу расплюшчыць вочы, задумацца над найгалоўным. Шчыра прызнаючыся таксама ў сваіх недахопах, ён сведчыць, што лепш вучыцца на чужых памылках, разумеючы пры тым, аднак, што ў кожнага свой шлях, што, на жаль, немагчыма дапамагчы ўсім. Але ж сумны канец чалавечага жыцця, якому былі абыякавыя ўсе побач. У адной з мініяцюр пісьменнік апавядае пра чалавека, якога не любілі *за брыдкае ўменне з рознай вады выходзіць сухім*[20]. Відаць, някепска ў яго вялося да пэўнага часу:

> Але ж і дажыванне ў яго было і па прыказцы: не бойся смерці, бойся старасці. Даседжваў, далежваў на сваім хутары адзін, усімі пакінуты, нямыты, нястрыжаны, барада па калені. Ні накарміць, хоць раз на дзень, ужо толькі з лыжкі, ні памыць, хоць раз на месяц у цэбры якім ці ў балеі, не было каму[21].

Безумоўна, жахлівая карціна! Аказваецца, смерць не самае горшае, што чакае чалавека. Яна можа вызваліць з цяжкіх умоў, закончыць

---

[17] Янка Брыль, *Сёння і памяць. Апавяданні, мініяцюры, эсэ*, Мінск 1985, с. 249.
[18] Янка Брыль, *Запаветнае*, с. 393.
[19] Янка Брыль, *Блакітны зніч*, с. 46.
[20] Янка Брыль, *Парастак*, с. 9.
[21] Тамсама.

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
*Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku – kontynuacja*,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki
na podstawie umowy BIBL/SP/0040/2023/01

мукі, але, бывае, яе прыходзіцца доўга чакаць. Так што дбай, чалавек, як вучыць пісьменнік, загадзя пра старасць і смяротны час.

Пакінулі зямное жыццё многія блізкія Брылю людзі, сябры, знаёмыя. Ён часта, асабліва пасля смерці любімай жонкі, успамінаў мінулае, вяртаўся да незабыўных хвілін, якія праводзіў з людзьмі, якіх не стала побач. Даглядаў і сцярог Я. Брыль гэтыя ўспаміны як штосьці найдаражэйшае. Смех сябра выклікае думку пра радасць тых, хто адышоў, радасць, якую забралі яны з сабой туды, адкуль няма звароту. Словы пісьменніка выклікаюць і смутак, і надзею, што куды б ні трапіла душа, яна павінна знайсці спакой і шчасце, бо бярэ з сабой толькі радасць. Усё кепскае адыходзіць у небыццё.

“Memento mori” – назва аднаго з апавяданняў Янкі Брыля і адначасова, хіба, адна з найгалоўных ідэй, якія прасякаюць лірычныя запісы пісьменніка. Можна разумець гэты афарызм па-рознаму. Але ў Брыля ідзе гаворка найперш не пра немінучасць смерці. Пісьменнік звяртае ўвагу на кароткачасовасць і незваротнасць жыцця, на сэнс, які мы яму нададзім. Лірычная проза дазволіла пісьменніку дзяліцца з чытачом думкамі, спавядацца ў сваіх пачуццях, глыбока раскрываць душу на працягу многіх гадоў. Якраз найперш у жанры лірычнай мініяцюры Я. Брыль змог выказаць сваю любоў да жыцця, удзячнасць свету за яго харaство.

25 ліпеня 2006 года Янка Брыль пайшоў на спатканне з жонкай, бацькамі і ўсімі тымі, хто, як ён спадзяваўся, чакаюць яго ў Вечнасці. Але, адначасова, ён жыве надалей у сваіх кнігах і найперш, відаць, у лірычных мініяцюрах, якія сталі галоўным жанрам яго творчага шляху, дазволілі чытачу пазнаёміцца з Я. Брылём – Чалавекам і Мастаком слова. Урэшце, Брыль пакінуў запавет, які павінен стаць дэвізам кожнага чалавека – трэба радавацца жыццю і дзяліцца гэтай радасцю з іншымі.

Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
*Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku – kontynuacja,*
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki” Ministra Edukacji i Nauki
na podstawie umowy BIBL/SP/0040/2023/01